# ПАГОНЯ

ЗАСНАВАНА У 1920 г

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

№ 30 (177) • 26 ліпеня — 1 жніўня 1996 г. • Кошт свабодны


## ЗАЎТРА - ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ!

**Сьвяточныя мерапрыемствы з нагоды гэтага сьвята пачынаюцца ў Горадні ўжо сёньня.**

**А 17-й гадзіне ў тэатры лялек гарвыканкам праводзіць урачыстае паседжаньне грамадзкасьці і канцэрт мастацкай самадзейнасьці.**

Заўтра з 10 да 12 гадзінаў чыноўнікі гарвыканкаму і аблвыканкаму будуць ускладаць кветкі да памятных месцаў горада.

А дзесятай гадзіне ад мемарыяльнай дошкі паўстанцам 1863 году, усталяванай на чыгуначным вакзале да Грунвальдзкага камня на Каложы пройдзе шэсьце, арганізаванае гарадзкой радай БНФ.

У 16-ць гадзін у абласным драмтэатры пачнецца IV Фестываль беларускай эстраднай песьні "Песьня над Нёманам". Скончыцца сьвяточны дзень гульнямі ў Старым парку.

## "ЧУЖУЮ" ПРЭСУ "НЕ ПУШЧАЦЬ"!

**Сёньня раніцай у Шчучыне пачалася нарада абласной "вертыкалі" па выніках працы гаспадаркі вобласьці ў першым паўгоддзі. Ня выключана, што ўдзел у ёй возьме і Аляксандр Лукашэнка.**

Прадстаўнікоў незалежных сродкаў масавай інфармацыі дапускаць на сустрэчу забаронена.

## ЮБІЛЕЙ ЦАРКВЫ

Ў нядзелю Гарадзенская Уладзімірская царква будзе адзначаць сваё 100-годдзе, Мяркуецца, што ў сьвяточных мерапрыемствах возьме ўдзел Патрыяршы Экзарх Беларусі, мітрапаліт Менскі і Слуцкі Філарэт.

## ВОЛЬНІЦА СКОНЧЫЛАСЯ

**З 250 гарадзенцаў, якія ў свой час паступілі ў Гарадзенскі універсітэт па накіраваньню аддзелаў народнай адукацыі і скончылі яго ў 1996 годзе, на працу ў вёску паехаў толькі 131 чалавек.**

У Кабінеце Міністраў зараз разглядаецца праект пастановы, згодна з якой у 1997 годзе будзе ўведзена абавязковае разьмеркаваньне выпускнікоў. Тым з іх, хто трапіць на працу ў вясковыя школы, прыйдзецца адпрацаваць там 2-3 гады.

**Віктар ЛЮДВІКОВІЧ.**




27 і 28 ліпеня чакаецца пераменная хмарнасьць, пераважна без ападкаў. Толькі ўдзень 28 ліпеня месцамі могуць прайсьці кароткачасовыя дажджы.

Вецер заходні, 4-9 м/сек.

Тэмпература ўначы - 8-13. Тэмпература ўдзень будзе такая: 27 ліпеня:20-25, 28 ліпеня - 18-23.

## ЗАКЛІКАЕМ ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ РАШЭНЬНЕ!

***Аляксандру Дубко, старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму;***

***Генрыху Крупенку, старшыні Гарадзенскага гарвыканкаму;***

***Барысу Казялкову, старшыні адміністрацыі Ленінскага раёну Горадні..***

*Прынятае Вамі рашэньне аб перасяленьні, а фактычна аб высяленьні культурна-асьветніцкага фонду "Бацькаўшчына", газеты "Пагоня", маладзёжнага альянсу імя Вітаўта Вялікага, Таварыства Беларускай Мовы імя Францыска Скарыны, Таварыства Беларускай Школы, клубу "Паходня", у якіх актыўна працуюць сотні жыхароў Горадні, дэстабілізуе грамадзянскую згоду і, па-сутнасьці, выклікае канфрантацыю.*

*Гэтае рашэньне мае відавочную палітычную падаплёку і ня мае нічога агульнага з намерамі палепшыць умовы "работы служб отдела социальной защиты, Государственной налоговой инспекции и отдела народного образования Ленинского района". Яно ніяк не паўплывае на заробкі настаўнікаў і на выплату пеньсій. Ад гэтага не павялічыцца паступленьне падаткаў у бюджэт. Затое будзе разбурана наладжаная праца на карысьць грамадзтва. Будзе разбураны аўтарытэт гарадзенскай улады, якая дагэтуль была ўзорам дэмакратыі і талерантнасьці.*

*Мы настойваем на спыненьні спробаў пасеяць насеньне разладу, у той час, калі ўсім нам патрэбна канструктыўная праца па кансалідацыі грамадзтва перад тварам цяжкіх выпрабаваньняў.*

**Віктар Какарэка, старшыня Гарадзенскай арганізацыі Аб'яднанай Грамадзянскай партыі.**

**Міхаіл Патрэба, старшыня Гарадзенскай гарадзкой філіі Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.**

**Сьвятлана Іоська, старшыня суполкі Беларускай Нацыянальнай Партыі Ленінскага раёну Горадні.**

**Кастусь Жынь, старшыня Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі Партыі Беларускага Народнага Фронту.**

## ГАРОДНЯ НЯ ЛЮБІЦЬ СВАЮ ГАРЭЛКУ

**Найменшым попытам сярод моцных алкагольных напояў у Горадні карыстаецца гарэлка... гарадзенскага лікёра-водачнага завода. З усёй колькасьці гарэлкі, якая прадаецца ў крамах горада, яе ўдзельная вага складае 5-10 працэнтаў.**

Нават пры тым, што вытворчасьць гэтага напою ў гэтым годзе рэзка скарацілася, на складах прадпрыемства знаходзіцца нерэалізаванай прадукцыі на 9 мільярдаў рублёў.

Не карыстаецца попытам у краіне і прадукцыя аграфірмы "Мажэйкава", якая ў траўні адчыніла лінію па выпуску алкаголю. Але лідзкім вытворцам удаецца збыць частку сваіх вырабаў у Латвію.

У Горадні ж праблему вырашаюць штучным шляхам. Так, некаторыя фірмы і арганізацыі, якім гарвыканкам выдаў ліцэнзіі на гандль алкаголем, абавязваюцца прадаваць толькі прадукцыю гарадзенскай вытворчасьці. У ліпені на такіх умовах ліцэнзіі атрымалі акцыянерныя таварыствы "Гроднааўтасэрвіс", станцыя тэхабслугоўваньня N 1 і МП "Шанц".

## МАНАШКІ ЎВАХОДЗЯЦЬ У РЫНАК

**Гарадзенскі Раства-багародзічны жаночы манастыр атрымаў ад гарадзкіх уладаў дазвол на адкрыцьцё гандлёвага кіёску.**

Манастырская гандлёвая кропка будзе мясьціцца ў раёне Савецкай плошчы, дзе запраектаваны мікрарынак па продажу кветак.

**В.ДРЭМА**

## НА МЕЛЬНІКА ХОЦЬ ПЫЛ АСЯДЗЕ

Сёлета ў Беларусі чакаецца добры ураджай хлеба. Значную частку яго перапрацуе Лідзкі камбінат збожжапрадуктаў. Акрамя таго, дзякуючы адпрацаваным сувязям, камбінат няспынна атрымлівае сыравіну для вытворчасьці мукі і камбікармоў з Украіны, Расеі, Казахстана, Германіі, Польшчы, Даніі, Канады, ЗША. Французкая фірма "Санофі" пастаўляе канцэнтраты і віітамінныя дабаўкі, фіны - ферменты, што дазваляюць уводзіць у склад камбікорму да 35 адсотак жыта.

Вядзецца будаўніцтва цэха абдзіраньня і эструдзяваньня ячменю. У бліжэйшы час будзе здадзены цэх фасоўкі мукі і крупаў. Адным словам, каля хлеба не прападзеш.

**С.СУДНІК**

## У ВЕДАМСТВЕ ЦІЦЯНКОВА ДУРНЯЎ НЯМА

**Яшчэ зусім нядаўна распрацоўваліся планы ператварыць Парэчча ў пэрлу Гарадзеншчыны. Усё неабходнае для гэтага ёсьць: жыватворнае паветра сасновага бору, чыстыя азёры, выдатная мінеральная вада, гаючыя гразі. І амаль увесь персанал мясцовага санаторыя ў свой час пасьпеў папрацаваць у Друскеніках, гэта значыць мае прафесійны досьвед.**

**На няшчасьце, ужо пачатыя працы па зьдзяйсьненьню гэтых планаў спынена і, падобна, надоўга...**

- У нас ёсьць усё, акрамя сродкаў, - расказвае старшыня Парэцкага пасялковага савету Віктар Хацян.- Парэчча, па сутнасьці, складаецца з санаторыя і калгасу "Радзіма". Абодва яны ў вельмі цяжкім фінансавым становішчы. Нядаўна разглядаўся варыянт: санаторый забірае сабе адміністрацыя прэзідэнта разам з калгасам у якасьці падсобнай гаспадаркі. Але нешта ня выйшла.

Мы ведаем, што! У ведамстве Ціцянкова дурняў няма: навошта ім браць дзіравы мяшок, калі ў іншым месцы возьмуць поўны? Калі забраць сабе Парэчча, трэба будзе нешта ўкладваць, а гэта сумна. Зрэшты, В.Хацян лічыць, што для папраўкі спраў пакуль хапіла б проста добраўпарадкаваньня, таму што адпачываючыя не жадаюць хадзіць па пыльных вуліцах сярод пашарпаных сьцен. Таму і рушацца планы дачакацца вельмі пажаданых замежных гасьцей, хаця б палякаў.

Адміністрацыя прэзідэнта - адзіная структура, якая б магла ўкласьці грошы ў разьвіцьцё інфраструктуры курорту. Затраты акупіліся б вельмі хутка. Парэчча стала бы курортам "всерьез и надолго". Але ціцянкоўскія хлопцы гэтага ня робяць. Ці не таму, што самі сябе адчуваюць не ўсур'ёз і не надоўга?

Я ў Парэччы прабыў два дні і ўцёк. Падумаць толькі, пазнаёміўшыся з сімпатычнай адпачываючай, няма дзе яе шампанскім пачаставаць! Колішні патрэбсаюзаўскі рэстаран, падобна, зачыніўся, але не таму што няма жадаючых туды хадзіць. Людзі перасталі хадзіць з прычыны неверагоднага запусьценьня і спарахнеласьці, у гэтай "кропцы" проста няўтульна. Няма кафэ, няма нават рамесьнікаў - ніводнай майстэрні! Ніхто ня хоча браць на сябе ласьню, якую даўно ўжо прапаноўвае мясцовы Савет. А між іншым у Парэччы ёсьць заможныя людзі: у невялікім пасёлку ўсё пра ўсіх вядома... Але яны ня вераць! Вось калі б прэзідэнцкая каманда ўклала грошы ў Парэчча, дык і для мясцовых быў бы прыклад, што гэта ўсур'ёз і надоўга.

**Алесь НАРБУТ.**




## ПРЭЗЕРВАТЫВЫ - БЯСПЛАТНА

У большасьці з 130 выяўленых у Беларусі выпадкаў заражэньня СНІДам хвароба перадавалася палавым шляхам. У сувязі з гэтым гарадзенскі абласны цэнтр прафілактыкі СНІДу зьбіраецца арганізаваць у бліжэйшы час раздачу бясплатных прэзерватываў у месцах адпачынку моладзі.

**ВІТАЎТ РУДНІК**

## ПАШКАДАВАЎ САБАКУ

Ля вёскі Канюхі жыхар адной з вёсак Гарадзенскага раёну, каб не наехаць "Жыгулямі" на сабаку, рэзка націснуў на тормаз. У выніку яго жонка ўдарылася галавой аб стойку машыны. Прыкладна праз тыдзень пасьля паездкі яна была зьмешчана ў бальніцу.

**А.ДУК.**

## НЯМА НІЧОГА ТРЫВАЛАГА

За першыя сёлетнія паўгады ў Лідзкім раёне ўзята 105 шлюбаў, а распалася 73. З іх 33 прыпалі на сем'і, дзе мужу і жонцы яшчэ не споўнілася і 20 гадоў. За гэты ж час у раёне памерла 531 чалавек, а нарадзілася ўсяго 212 дзяцей (107 хлопчыкаў і 105 дзяўчынак)

**ВАЦЛАЎ СЯРПІНСКІ**

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

# ПЯЦІГОДКУ - ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ, У ТРЫ ЗЬМЕНЫ, УДВАІХ, ЗА АДНУ ЗАРПЛАТУ

**Набліжаецца сьвята Незалежнасьці Беларусі. Будзе сказана шмат слоў. Патрыёты скажуць свае словы пра неабходнасьць суверэнітэту. Зампаліты з "вертыкалі" давядуць пра тое, што малодшы брат мусіць слухацца старэйшага. А я хачу сказаць зусім неафіцыйныя словы, хаця і з нагоды 27 ліпеня.**

XX стагоддзе Беларусь заканчвае дастаткова сумнымі вынікамі. Беларускае дэмакратычнае адраджэньне, узьнікшае на хвалі распаду таталітарнага камуністычнага СССР, не было падтрымана большасьцю народу. У выніку адбылася рэстаўрацыя мінулага рэжыму ў выглядзе аўтарытарна-ахлакратычнай формы праўленьня. Існуе штучная кансервацыя "саўковага" ладу жыцьця. Суседнія краіны здолелі зрабіць за апошнія гады разьбег для скачка ў XXI стагоддзе. Беларусь - усё яшчэ зжывае заганы мінулага.

Безумоўна, тормазам грамадзкіх пераўтварэньняў зьяўляецца наша сьвядомасьць. Менталітэт. Сьветапогляд. А менавіта: тыя якасьці, якія дазволілі беларусам выжыць і захаваць сваю адметнасьць пасьля 200 гадоў Рэчы Паспалітай і 200 гадоў Расейскай Імперыі.

Талерантнасьць, альбо цярпімасьць, зьяўляецца неад'емнай рысай беларусаў. Аднак цярпімасьць да іншых поглядаў і складаў жыцьця перарастае ў абыякавасьць да ўласных. Беларус гатовы забыцца пра свой уласны вопыт і свае інтарэсы і выконваць парады, ці нават загады, іншаземцаў. У выніку беларус пераконваецца, што іншаземец пільнаваў сваекарысныя інтарэсы, але па-ранейшаму захоўвае бездакорную талерантнасьць.

Беларус умее і любіць працаваць. Але ён ня ў стане ўцяміць, што плён яго працы не належыць нікому іншаму, акрамя яго самога. Што спакусьлівасьць і нахабства не даюць права на валоданьне чужой маёмасьцю. Што гаспадар ня толькі вольны, але абавязаны бараніць сваю маёмасьць хоць бы ўзброенай сілай. Такім чынам, плёнам працы беларуса не карыстаецца толькі лайдак. Сам гаспадар суцяшаецца сваёй велікадушнасьцю.

Беларус здольны ўпітваць чужую культуру, аднак да сваёй, нацыянальнай, адметнай ставіцца з пагардай. Выракаючыся сваёй культуры, ён ніколі не дасягае вышынь у культуры іншаземнай і вызначаецца спрадвечным правінцыялізмам.

Адсутнасьць уласнага розуму вядзе да страты волі і перспектывы. Беларус самаўхіляецца ад вызначэньня сваёй будучыні, ня ведае вартай вялікіх высілкаў мэты, ніколі ня робіць своечасовага выбару, не валодае ініцыятывай, а таму - заўсёды апошні.

Фактычная бездапаможнасьць беларуса ў навакольным сьвеце замяшчаецца ягонай сьпецыфічнай хітрасьцю. Беларусу стане мудрагелістасьці, каб падмануць свайго крыўдзіцеля, але ён чакае, пакуль той сам не спатыкнецца ці не нарвецца на такога ж спрытняка. Чаканьне спагадлівасьці лёсу і гістарычнай справядлівасьці прыводзіць да таго, што пакуль беларус чакае, яго пасьпяваюць падмануць двойчы. І яшчэ ніхто не даставаў за яго каштаны з полымя.

Што мы маем на сёньня? Маем уладу - шамана, якая топае нагамі і вые на поўню каб выклікаць дождж, а дождж усё не ідзе. Тых, хто асьмельваецца сумнявацца ў магчымасьцях шаманскіх заклінаньняў, шаманы прыносяць у ахвяру. Бясспрэчна, што шаманства ўспрымаецца электаратам як самы эфектыўны спосаб выклікаць дождж. Пакуль у нашых галовах будуць жыць даведзеныя да абсурду рысы нацыянальнага характару, сьпіцы шаманскія танцы будзе складана.

**СЯРГЕЙ САМАСЕЙ**




# "У НАС МОЖА БЫЦЬ УСЁ"



"Ніякі праект зьменаў у Канстытуцыі ня можа разглядацца без распрацоўкі ў канстытуцыйнай камісіі, стварыць якую можа толькі Вярхоўны Савет. Ніякіх праектаў накшт магчымых папраўак да Асноўнага закона краіны ў парламант з боку прэзідэнта не паступала. А таму, нават улічваючы, што у нас усё можа быць, гаварыць сур'ёзна пра рэферэндум аб зьменах у Канстытуцыі нельга - заявіў на сесіі Гарадзенскага абласнога Савету сябра прэзідыуму беларускага парламанту Сямён Домаш.

Усе намаганьні ўлады, на думку сп. Домаша, сёньня павінны быць накіраваны на выпрацоўку канцэпцыі разьвіцьця краіны ў бліжэйшы час. "Лічыць такой канцэпцыяй апублікаваныя 8 чэрвеня ў "Рэспубліцы" "Основные аспекты идеологии белорусской государственности", створаныя друга- і нават трэцеразраднымі асобамі нельга. Вярхоўны Савет дзеля выпрацоўкі ўласнай стратэгіі стварыў часовую камісію, узначаліць якую прапанавана прэзідэнту. Аднак адказу ад яго пакуль не паступіла", - зазначыў прамоўца. Рэзка негатыўную ацэнку з вуснаў сп. Домаша атрымалі пампезныя фестывалі, на якія выкідваюцца вялізныя сродкі: "Калі на вуліцах штодня зьяўляецца ўсё больш і больш жабракоў, усё гэта выглядае надзвычай амаральна".

**ВІТАЎТ РУДНІК**
**Фота Я.Ванюкевіча**

# СТВОРАНА ФРАКЦЫЯ ПА ЗАХАВАНЬНЮ ГРАМАДЫ

**Пасьля 5 надзвычайнага зьезда БСДГ, на якім было прынята рашэньне аб аб'яднаньні з ПНЗ, сябры Грамады ня згодныя са зьліцьцём двух партый у адну, утварылі Фракцыю па захаваньню Грамады. Фракцыя распаўсюдзіла зварот да сяброў БСДГ і грамадзян Беларусі.**

У ім выказваецца меркаваньне, што рашэньне зьезда парушае Статут БСДГ. Кіраўніцтва, якое прыняло ўдзел у аб'яднаным зьезьдзе з сябрамі ПНЗ "уступіла ў склад новай партыі і, у адпаведнасьці з п. 3.2. Статута Грамады, які забараняе адначасовае сяброўства ў двух партыях, выйшла з БСДГ."

На думку сяброў Фракцыі, такім кіраўніцтва. Для захаваньня партыі плануецца "да 1 кастрычніка 1996 годуправесьці перарэгістрацыю ўсіх сяброў БСДГ, якія не жадаюць уступаць у новую партыю...". Пасьля чаго склікаць надзвычайны зьезд, з мэтай абраньня новага кіраўніцтва.

Старшынём Фракцыі па захаваньню Грамады абраны Віталь Скалабан.

**Д.КІСЕЛЬ**

# ГОД МІРУ

**"Дзеяньні выканаўчай улады не спрыяюць устанаўленьню стабільнасьці ў краіне" - лічаць удзельнікі рэспубліканскага нарады прагрэсіўных сілаў Беларусі.**

Выступаючы на прэс-канферэнцыі па выніках форума, былы старшыня Вярхоўнага Савету С.Шушкевіч паведаміў, што ўдзельнікі нарады прынялі рашэньне аб стварэньні аргкамітэту новага грамадзка-палітычнага руху, які павінен аб'яднаць разнастайныя палітычныя партыі на прынцыпах павагі да Канстытуцыі.

Па словах намесьніка старшыні парламанту Генадзя Карпенкі, "многія палітычныя сілы рэспублікі гатовыя абвясьціць "год міру". З прапановай падтрымаць іх ініцыятыву ўдзельнікі нарады зьвярнуліся да А.Лукашэнкі.

Галоўнай умовай "міру" зьяўляецца прытрымліваньне Канстытуцыі.

**Э.-Х.**

# НА ПАДТРЫМКУ МАЛАДЫМ

**18 ліпеня ў Маладэчне адбыўся ўстаноўчы сход мясцовай філіі Беларускай Дэмакратычнай Арганізацыі Ветэранаў. Старшынём новай філіі быў абраны сп. Тадэвуш Шусьціцкі.**

Удзел у сходзе бралі прадстаўнікі БНФ, Беларускага Дэмакратычнага Саюзу Моладзі і сакратар кантрольнай камісіі Хельсінскага праваабарончага камітэту, сябра праўленьня беларускай асацыяцыі журналістаў Алесь Мікалайчанка. Удзельнікі сходу выказаліся за кансалідацыю ўсіх дэмакратычных сілаў для абароны правоў чалавека, Канстытуцыі і Незалежнасьці.

Першай акцыяй новай ветэранскай арганізацыі стане ўдзел у сьвяце паэзіі і песьні "Ракуцёўскае лета", якое прысьвечана Максіму Багдановічу і прымеркавана да Дня Незалежнасьці.

**Алесь ЦАДКО.**

# "НАЦЫЯНАЛІСТ ЗАЎСЁДЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПРЫСТОЙНЫМ І ГОДНЫМ"

**На Беларусі пачала фармавацца па-сапраўднаму ўльтрарадыкальная нацыяналістычная арганізацыя — "Белы легіён". З кіраўніком гэтае арганізацыі Сяржуком Чыслававым мая размова.**

— Нашая арганізацыя ўтворана менш чым паўтары гады таму, утворана не на пустым месцы. Шмат хто з сяброў "Белага легіёна" раней уваходзіў у Беларускае згуртаваньне вайскоўцаў.

***— Гэта адбылося на глебе непаразуменьня з БЗВ, альбо нешта іншае вымусіла вас да стварэньня асобнай арганізацыі "?***

— Асноўная прычына, гэта сыход з БЗВ старога яе лідара. Адэкватнай замены яму не знайшлося. Другая прычына, гэта тое, што драбы - хлопцы ў асноўным малады і ў іх існуе крыху сваё, адрознае ад БЗВ, бачаньне і разуменьне праблемаў, ёсьць свае мэты.

***— Якія?***

— Арганізацыя ўзьнікла, як адказ на той стан нашай дзяржаўнасьці, які мы маем на сёньняшні дзень. Мы нармальныя нацыяналісты, нацыяналісты ў эўрапейскім, а не ў бальшавіцкім, разуменьні гэтага слова. Наша меркаваньне такое: той, хто любіць сваю зямлю, той ня будзе абражаць зямлю сваіх суседзяў. Асноўная наша мэта — гэта пабудова моцнай Беларускай дзяржавы. "Белы легіён" не імкнецца і не зьбіраецца выстаўляць сваіх кандыдатаў пад час выбараў у розныя Саветы. Мы будзем у бліжэйшыя гады рыхтаваць моладзь, гадаваць для сябе кадры. Мы хочам сабраць менавіта такіх людзей, якія імкнуцца чагосьці самі ў гэтым жыцьці дасягнуць. Ім, маладым, кіраваць потым гэтай дзяржавай і яны будуць тым падмуркам, які мы павінны закласьці.

***— Чым выхаваньне моладзі ў "Белым легіёне" адрозьніваецца ад выхаваньня ў іншых арганізацыях?***

— Мы лічым, што зараз патрэбна ўзгадоўваць новую шляхту, новую беларускую эліту. У нас для гэтага існуе цэлы комплекс. Гэта і фізічнае ўзгадаваньне, і маральнае, і, плюс да ўсяго, псіхалагічнае. Усё ж мужчына павінен быць байцом. Нам патрэбна выхаваць такога беларуса, які ня будзе маўчаць, калі яму плююць у твар.

***— Сябрамі "Белага легіёна" могуць быць дзяўчаты, жанчыны?***

— Не.

***— На колькі моцна пачувае сябе " Белы легіён " на Гарадзеншчыне?***

— У Горадні існавалі драбы і раней, але "Белы легіён", на жаль, ня мае пакуль там таго ўзроўню, якога б хацелася. Тут у нас ёсьць такая праблема, што на ўсходзе Беларусі арганізацыя мацнейшая, чым на захадзе.

***— Чаму так?***

— Мяркую, што з-за таго, што на захадзе Беларусі тыя людзі, хто меў актыўную пазіцыю, палітычна вызначыліся праз дэмакратычныя партыі. А на ўсходзе гэтыя партыі прыжываліся кепска. І зараз на ўсходзе ідзе больш ўціск і ў нармальных людзей узьнікае большае жаданьне супрацьдзеяньня.

***— Якія партыі на Беларусі вам найбольш імпануюць, з кім вы гатовыя супрацоўнічаць?***

— Бадай, ні з кім. Нам ня хочацца пагразнуць у гэтых палітычных палеміках. Недадэмакраты, передэмакраты... Не яны зараз будуць вызначаць лёс гэтай краіны.

***— А хто?***

— Прыклад прэзідэнта паказаў, што тут зараз патрэбна сіла. Лукашэнка вельмі красамоўна прадэманстраваў, як трэба ўводзіць сімволіку. Паглядзі па Менску, нідзе " Пагоні " ды бел-чырвона-белага сьцяга няма. А як дэмакраты ўводзілі сімволіку ? Да гэтага часу віселі СССР-скія ды БССР-скія атрыбуты. Будзе вызначаць тут усё той, хто будзе дэманстраваць волю.

***- Вы прызнаеце, увогуле, такі шлях разьвіцьця грамадства, як праз дэмакратызацыю ?***

— Так, прызнаем, але тут могуць быць розныя варыянты.

***— Вы спрабавалі наладзіць кантакты з нацыяналістычнымі арганізацыямі іншых краінаў?***

— Так. Мы гатовыя супрацоўнічаць з любымі нацыяналістамі любой краіны, будзь то Расея ці Польшча, нас гэта не хвалюе. Мы самі нацыяналісты і мы паважаем нацыяналістаў.

***— Апошні час у беларускай прэсе шмат увагі ўдзялялі ўкраінскай арганізацыі УНА-УНСО. Вы з імі супрацоўнічаеце ?***

— На Украіне ёсьць некалькі арганізацый такой жа накіраванасьці, як і мы, скажам Кангрэс украінскіх нацыяналістаў УНСО. Мы іх лічым нармальнымі нацыяналістамі, з якімі можна супрацоўнічаць. Але я ня бачу патрэбы ў іх прыездах на мітынгі ў Беларусь. Я лічу, што мы тут справімся самі.

***— Планы "Белага легіёна" на бліжэйшы час?***

— На Дзень Незалежнасьці ў нас ёсьць ідэя зрабіць сваё мерапрыемства. Пакуль не хачу казаць - якое. Справа ў тым, што мы зыходзім з таго, што ўсё беларускае павінна быць вышэйшага гатунку. Мы гэта мерапрыемства правядзем, калі знойдзем на яго дастаткова грошай. Калі не, то нават ня будзем брацца. Трэба, каб беларускае было такім, што чалавеку пабочнаму, паглядзеўшы, таксама захацелася быць беларусам. Нацыяналіст заўсёды павінен быць прыстойным і годным.

***- Было шмат арганізацыяў, якія някепска пра сябе заяўлялі, тое ж БЗВ, але ад некаторых зараз асталіся толькі іх заявы. Ты не баішся, што і вашу арганізацыю напаткае такі ж лёс?***

— Я думаю, што з нашай такога ня здарыцца. У нас прыярытэт справы над словам.

**Гутарыў Людвік ВАЛЫНЕЦ.**

# З ПЛЕЧ ДАЛОЎ І З СЭРЦА ВОН!

**Дэпутаты абласнога Савету "прынялі да ведама", што бюджэт вобласьці ў першым паўгоддзі выкананы ўсяго на 36,5%. У скарбонку дзяржавы недабрана 250 мільярдаў рублёў.**

Асноўную ж сваю ўвагу на сесіі абласнога Савету, якая прайшла 19 ліпеня, народныя засядальнікі засяродзілі зусім на іншых, другарадных праблемах.

Галоўным пунктам у павестцы дня сесіі быў аналіз работы жыльлёва-камунальнай гаспадаркі вобласьці. Напачатку дэпутаты прагледзелі 55-хвілінную стужку "Гарачае лета камунальнікаў", якая дапоўніла надрукаваны раней у "Гродзенскай праўдзе" справаздачны даклад. Абмеркаваньне выявіла, што згвалчаныя прэзідэнцкімі "установамі" браць 80 працэнтаў кошту камунальных паслугаў з кішэні насельніцтва, жыльлёва-камунальныя службы выбіваюць усімі сродкамі грошы з уладальнікаў жыльля. Толькі ў Горадні за пратэрміноўку кватрплаты ў тысячы кватэр адключана электраэнэргія, у 138 - газ. Запазыка некаторых сем'яў перавышае тры мільёны рублёў. І гэта пры тым, што за ваду і каналізацыю дзяржава бярэ толькі 25, за цяпло - 40, экалогію жыльля - 45 працэнтаў ад іх сабекошту. А што будзе, калі гэтыя паказчыкі ўзьняць да патрабуемых 80 працэнтаў?! Можа кватрплату за безнаяўны разьлік будуць браць, як прапанаваў намесьнік старшыні аблвыканкаму Віктар Чорны? З-за адсутнасьці сродкаў у бюджэце ў жахлівым стане знаходзяцца дарогі ў вобласьці (68 % патрабуюць пільнага рамонту), вадапроводы (у Мастах у 92,7% пробаў вады заявлічаная колькасьць шкоднага для здароўя жалеза; частка гарадзенцаў спажывае ваду з Нёмана, у якім і купацца ўжо нельга).



На фоне ўсіх гэтых праблемаў як сапраўдны зьдзек над рэчаіснасьцю прагучаў выступ намесьніка жыльлёва-камунальнай гаспадаркі краіны Георгія Дабравольскага, які паўгадзіны патрабаваў "дальнейших усилий" па выкананьню прэзідэнцкай стратэгіі разьвіцьця гаспадаркі, "большей активизации ремонта кровли" і г.д.

У выніку абмеркаваньня дэпутаты аднагалосна зацьвердзілі Праграму мераў па перспектыўнаму разьвіцьцю і ўдасканаленьню жыльлёва-камунальнай гаспадаркі вобласьці.

Ніхто з дэпутатаў нават не выказаў сумненьня ў тым, што яна будзе рэалізаванай. Маўклівае "за" увогуле становіцца адметнай рысай паводзінаў новага абласнога Савету. Некалькі месяцаў назад гэтак жа маўклівa быў зацьверджаны бюджэт вобласьці, які сёньня з трэскам праваліўся. Хвалебныя паведамленьні аб дасягнутым росьце вытворчасьці ў вобласьці на 1,5 працэнта на справе аказаліся залежамі гатовай прадукцыі на складах прадпрыемстваў на агульную суму 753 мільярды. 99 прадпрыемстваў (48 працэнтаў ад усёй колькасьці) свае вытворчыя паказчыкі зьнізілі. У выніку бюджэт недаатрымаў звыш 100 мільярдаў рублёў. Сьледзтвам гэтага стала запазыка бюджэта па асноўных артыкулах запланаваных выдаткаў на 380 мільярдаў. Гэтыя грошы не атрымалі медыкі, будаўнікі, настаўнікі, работнікі культуры. На катастрафічнае становішча з выкананьнем бюджэту зьвярнуў увагу ў сваім выступе і прысутны на сесіі сябра Прэзідыуму Вярхоўнага Савету, а таксама дэпутат аблсавету Сямён Домаш.

Прыведзеныя вышэй лічбы, аднак, за жывое дэпутатаў, у затылак якім дыхала ў два разы большая колькасьць запрошаных на сесію вертыкальшчыкаў, не кранулі. Узьняты ў гару рукі справаздачу аб выкананьні бюджэту "прынялі да ведама" і даручылі аблвыканкаму "мабілізаваць існуючыя магчымасьці". заслухаўшы таксама інфармацыю аб выкананьні Закона "Аб адукацыі", папраўкі да праграмы прыватызацыі, аб зьменах у статутах падаходнага падатку для асобных відаў прадпрымальніцкай дзейнасьці, дэпутаты з лёгкім сэрцам разьехаліся па хатах. Выконваць стратэгічную прэзідэнцкую лінію.

**ВІТАЎТ РУДНІК**

**На здымку: Усё нармальна, "папа"! Фота: Я.Ванюкевіча.**

# НА ПЕНЬСІЮ - ЗАГАДАМ!

У Астравецкім раёне загадам кіраўніка РАНА У.Булавіцкага на пенсію адпраўлены ўсе настаўнікі пеньсійнага ўзросту. Выключэньне зробленае толькі для тых, хто працуе ў аддаленых , недаўкамплектаваных педагагічнымі кадрамі школах.

# ІНСЬПЕКТАР ПА СЬМЕТНІКАХ

У штаце ваўкавыскай міліцыі зьявілася новая пасада - экалагічны інсьпектар. З яго дапамогай гарадзкія ўлады спадзяюцца палепшыць экалагічную абстаноўку ў горадзе.

# ПРЫБІРАЛЬНЯ-ДОЎГАБУД

У Смаргоні з-за недахопу грошай спынена будаўніцтва падземнай прыбіральні, распачатае ў 1991 годзе. Пад вялікім пытаньнем і будаўніцтва новага сьметніка. "Пры такіх тэмпах фінансаваньня з боку дзяржавы, - заявіла нядаўна на сесіі абласнога Савету старшыня гарсавету Смаргоняў Ванда Мацкевіч, - чакаць сканчэньня будаўніцтва прыйдзецца 20 гадоў.

# ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ НЕ ПРАДБАЧЫЦЦА

У Бярозаўскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы спынены набор навучэнцаў. Па словах дырэктара шклозавода "Нёман" Анатоля Жыгалы, выпускнікоў ПТВ папросту няма куды падзець. Новыя працоўныя месцы на прадпрыемстве, якое сёньня мае клопаты з продажам ул~~с~~най прадукцыі (на складах яе ляжыць на 22 мільярды рублёў), не прадбачацца. На шклозаводзе сёньня працуе пяць тысяч чалавек.

# ВАДА СТАНОВІЦЦА РАСКОШАЙ

У асобныя раёны Слоніма вада падаецца па графіку і нават - у прывазной тары. Гарачую ваду сёньня ў горадзе маюць толькі шпіталь і лазьня.

Стары слонімскі водазабор магчымасьці свае ўжо вычарпаў. На будаўніцтва ж новага сродкаў няма.

**В.АНІМУЦКІ.**

# ПІЦЕ ПІВА ПЕННАЕ!




Апошнім часам нашы мужыкі пачалі скардзіцца на дарагавізну духмянага ячменнага напою. Карэспандэнт "Пагоні" пацікавіўся ў старшага тавараведа піўзавода Валянціны Лукашык, па якіх цэнтах адпускае завод піва гандлёвым прадпрыемствам. Аказалася, што бутэлька "Юбілейнага" адпускаецца за 2770 руб., "Белай Русі" - за 2820 руб., "Каласку" - 2610 руб. Дадаем 800 рублікаў за бутэльку. Аднак усё роўна не выходзім на цэну рознічнага продажу. У чым справа? У тым, што гандаль накручвае каля 30% ад адпускной цаны. Калі ўлічыць, што дастаўка ў магазін улічваецца заводам у сабекошт, то атрымоўваецца, што магазін бярэ 30% за тое, што перанёс бутэльку са склада на прылавак. "Абдзіралаўка" - сказаў я. Да таго ж , дадаю, у магазінах не жадаюць прымаць пустую бутэльку. "Гэта так, - пагадзілася сп. Лукашык, - завод пастаянна адчувае недахоп зваротнай тары, а новая бутэлька даражэй у два разы".

Як на думку аматараў піва, гарадзенскі напой бывае кіславатым і саступае знакамітаму лідзкаму, каторае спалучае гарчынку з салодкасьцю. Галоўную праблему стварае вада, якая ў горадзе моцна хларызуецца. Выйсьце адно-ачышчаць ваду сьпецыяльнымі фільтрамі. Але на іх патрэбныя грошы. З грашыма цяжка. Таму на заводзе існуе думка, што змагацца з лідзкімі канкурэнтамі трэба шляхам адміністратыўных заслонаў на шляху перамяшчэньня лідзкага піва ў Горадню. Аднак рэальна на гэта спадзявацца не выпадае, таму што ўсе разумеюць - рынак і спажывец такога не цярпяць.

Якія б йцяжкасьці не чакалі нашае грамадзтва, есьці і піці людзі не перастануць. Шаноўныя піўвары, дык пастаўце нам ачышчальныя фільтры!

**Сяргей САМАСЕЙ.**

# НА "ЗАМЕТКУ" ГІНЭСУ

МАЛАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ГРОДНА

**Ёсьць падстава сьцьвярджаць, што самы дарагі чаравік у сьвеце на мінулым тыдні быў прададзены ў Горадні.**

Адзіным лотам, які ўдалося прадаць на 20-м юбілейным аўкцыёне па продажу камунальнай маёмасьці, які прайшоў 18 ліпеня ў Горадні, была крама "Чаравічак" на вуліцы Ажэшкі. Зацятую барацьбу паміж трымя прэтэндэнтамі малаток аўкцыяніста спыніў на лічбе ў 700 мільёнаў (стартавы кошт 117 мільёнаў). На працягу бліжэйшых 10 гадоў "Чаравічак" пераходзіць у арэнду ў прыватныя рукі. Паспрачацца за іншыя чатыры вынесеныя на продаж аб'екты (у тым ліку за краму "Мелодыя") жадаючых не знайшлося. Нават за набіты экзатычнай садавінай, вінам і слодычамі кошык, выстаўлены на продаж з нагоды юбілею, аўкцыяністу з цяжкасьцю ўдалося дагнаць кошт да 310 тысячаў, што нават не кампенсавала страты на гэты сімвалічны лот.

**В.ДРЭМА.**

# АЎКЦЫЁН У ЛІДЗЕ

14 жніўня ў Лідзе ў зале паседжэньняў гарвыканкаму пройдзе чарговы аўкцыён па продажу аб'ектаў камунальнай уласнасьці. На аўкцыён выстаўляюцца пяць аб'ектаў: тры прадаюцца ва ўласнасьць, два здаюцца ў арэнду. Умовай продажу будынка на Перамогі, 65 зьяўляецца завяршэньне будаўніцтва спортзалы па вул. Гагарына. Нагадаем, што на мінулы аўкцыён заявак ад пакупнікоў не паступіла.

**Станіслаў СУДНІК.**

# КАРЫСЬЦЬ І ДЗЕЦЯМ

На базе вучэбнага цэнтру "Крынічнае" 6-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады створаны дзіцячы ваенна-спартыўны лагер. Сродкі на харчаваньне 50 падлеткаў з 20-й і 24-й гарадзенскіх школаў у памеры 9,6 мільёнаў рублёў пералічыў аддзел па ўпраўленьню камунальнай маёмасьцю і прыватызацыі гарвыканкаму. Яшчэ 4,8 мільёна за кошт прыбыткаў ад прыватызацыі пералічана аддзелу адукацыі Ленінскага раёну для дастаўкі гарадзенскіх школьнікаў у летнік клубаў ЮНЭСКА ў Ракаве.

**Ул.інф.**

# ЧАМУ ЗАГАРЭЎСЯ ТРАЛЕЙБУС?

**Нядаўна жыхары Горадні былі сьведкамі дзьвюх падзей, зьвязаных з грамадзкім транспартам. Зьяўленьне на вуліцах горада новага тралейбуса і пажар старога.**

Па словах намесьніка начальніка тралейбуснага ўпраўленьня Ю.Нерада, новы тралейбус эксперыментальны, зроблены на заводзе "Белкамунмаш". Гарадзенцы атрымалі новую машыну бясплатна, для правядзеньня выпрабаваньняў. Навінка якасна адрозьніваецца ад тралейбусаў, працуючых зараз у горадзе.

Рухацца тралейбус павінен плаўна, без рыўкоў. Ён не кранецца з месца, пакуль не зачыняцца дзьверы. У салоне мяккія сядзеньні, сучасны дызайн. Летам таніраванае шкло будзе абараняць ад сонца, а тры печкі - зімой ад марозу.

Але такі тралейбус адзін. І ў бліжэйшы час наўрад ці зьявяцца іншыя. Наадварот, іх у горадзе становіцца ўсё менш.

18 ліпеня а другой палове дня на прыпынку каля кінатэатра "Усход" загарэўся тралейбус. Галоўны інжынер упраўленьня лічыць, што гэта здарылася па віне вадзіцеля, які няправільна эксплуатаваў машыну пад час дажджу. Але выпадак пажару тралейбуса далёка не першы і ніхто не гарантуе, што апошні.

Па зьвестках, прыведзеных на сесіі аблсавету, у гэтым годзе не куплена ніводнага тралейбуса. Калі ў 1991 годзе ў Горадні іх было 171, дык сёлета застаўся толькі 141. Прычым 12 з іх павінны быць сьпісаны, а 19-ці тэрміновы патрэбен капітальны рамонт. На гэта ў бюджэце няма грошай.

**Д.КІСЕЛЬ.**

# МЯЖУ НА ЗАМОК

**"Мяжа з Літвой будзе ўмацавана", - паведаміў камандуючы памежнымі войскамі Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Маркоўкін пад час нядаўняга наведваньня Гарадзенскага памежнага атрада. Генерал патлумачыў, што выклікана гэта тым, што "Беларусь стала траньзітнай дзяржавай паміж Усходам і Захадам з узрастаючай міграцыяй праз яе тэрыторыю".**

Асаблівы клопат памежнікам прыносяць нелегальныя эміграны з афра-азіяцкіх краін і кантрабанда наркотыкаў. Генерал усьцешыў сваіх падначаленых тым, што значную долю выдаткаў возьме на сябе Расея, бо, як вядома, наша мяжа - расейская мяжа. Ужо ў 1997 годзе мяжа з Літвой будзе абазначана і ўмацавана выстаўленьнем слупоў, лёгкіх інжынерных збудаваньняў (калючага дроту), кантрольна-сьледавых палос.

Што забыўся сказаць спадар Маркоўкін? А тое, што па дадзеных статыстычнай службы таго ж Гарадзенскага памежатрада за 1995 год і палову 1996 году на тэрыторыю Беларусі не завезена з тэрыторыі Літвы ні аднаго грама наркотыкаў, не пранік ні адзін афра-азіят. У гэты ж час аб'ём наркотыкаў, якія паступаюць з Расеі, пастаянна расьце і лічыцца ўжо на цэнтнеры і тоны, а плынь афра-азіятаў - адтуль жа - на тысячы чалавек. Дык ці не мэтазгоднеў было б мацаваць мяжу з Расеяй?

**Станіслаў СУДНІК.**

# ГРОШАЙ ХАПІЛА ТОЛЬКІ НА ЗЮГАНАВА...

**Чытачы "Пагоні" не аднаразова абураліся тым, што рамонтныя працы па вул. Будзёнага ў Горадні да гэтай пары не скончаны. Для горада неабходна адкрыцьцё аўтамабільнай дарогі, зьвязваючай аўтобусны і чыгуначны вакзалы. Вуліца Ажэшкі, якая прымае на сябе ўвесь рух, не прыстасаваная для праезду вялікай колькасьці машын. Гэта нярэдка стварае на ёй небясьпечныя сітуацыі для аўтамабіляў і пешаходаў. Для высьвятленьня стану рамонту вул. Будзенага, наша газета зьвярнулася ў аддзел капітальнага будаўніцтва ВА ЖКГ гарвыканкаму.**

Па атрыманых зьвестках, рэканструкцыя дарогі пачалася ў траўні 1992 г. Планавалася пашырыць вуліцу. Правесьці тралейбусную лінію з разваротам каля заапарку. Але выдзеленых з бюджэту грошай хапіла толькі на пракладку дажджавой каналізацыі і тэлефанізацыю. На набыцьцё кабелю для тралейбуснай лініі і асьвятленьне, на перанос платоў і знос чатырох магазінаў неабходна 8 мільярдаў 492 мільёны рублёў. Разумеючы, што ніхто ім такія грошы ня дасьць, будаўнікі вырашылі скончыць рамонт па спрошчаным варыянце. Плануецца да канца году пракласьці па левым баку вуліцы тратуар. А на дарозе зрабіць ніжні пласт асфальтнага пакрыцьця, што дазволіць адкрыць аўтамабільны рух.

**З.ГЕНАШ.**

P.S. Па зьвестках газеты "Свабода", прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падтрымліваў Зюганава ў барацьбе за прэзідэнцкае крэсла ня толькі словам. Расейскім камуністам пераведзены сотні тысяч даляраў. А супрацоўніцтва з фондам Эсамбаева каштавала нашай краіне 75 мільёнаў "зялёных".

## 29, ПАНЯДЗЕЛАК

**Белорусское телевидение**

**7.25** Программа передач. **7.30** Утренний коктейль. **7.50** Экономикст. Недвижимость. **8.00** «Золотые ключи». Телефестиваль народного творчества. **8.40** Пресс-импреза. «Лечебное голодание: за и против». **9.20** «Еще не вечер...» Гость программы - семья Горячкиных. **9.35** Темная комната. Беззаконие. **10.05** Финансовое время. **15.15** «Флиппер». **15.40** Мультфильм. **15.50** Студия «Окно». «Остров вдохновения». **16.20** «Три истории с телефоном», «Подзорная труба». Короткометражные х/ф. **17.05** «На добрый лад». **17.20** Провинция. Талантливые люди Ляховичского района. **17.50** Неделя. Информационная программа. (Гр.) **18.20** Экология и мы. (Гр.) **18.40** Кронон. (Гр.) **19.00** «Риск-версия». Телеигра. **19.30** «Острый угол». Передача по письмам телезрителей. **20.00** «Музыкальный салон Элеоноры Езерской». «В парке Чаир всегда весна...» **20.40** Колыбельная. **21.00** Панорама. **21.45** Спортивный телекурьер. **22.05** Музыкальный антракт. **22.15** Фильмотека. Леонид Быков в х/ф «Разведчики». **23.30** Музыка без границ. Программа с участием Лины Мкртчан.

**ОРТ**

**5.00** Телеутро. **8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.45** Новости. **8.15, 17.20** «Новая жертва». **9.05** «Поле чудес». **10.05** «Человек и закон». **10.30, 18.35** «Угадай мелодию». **11.10** В эфире ТРК «Мир». **11.55, 15.45, 22.55** Олимпийские игры в Атланте. **14.20** «Рыцарь Отважное Сердце». **14.40** «Звездный час». **15.15** Музыкальный клип. **15.20** «Элен и ребята». **18.10** Час пик. **19.00** «Если...» Авторская программа В.Познера. **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.00** Время. **20.40** Сериал «Пропавшая экспедиция». 1-я серия. **22.05** «Серебряный шар».

**Канал «Россия»**

**6.30** Утренний экспресс. **7.00, 10.00, 13.00, 19.00, 22.00, 1.00** Вести. **7.20** «Волшебный школьный автобус» Мультсериал. **7.45** «Время деловых людей». **7.55** Петербургские сезоны. **8.25, 20.05** «Санта-Барбара». **9.20** Олимпиада-**96**. Легкая атлетика. **9.55** «Телемагазин». **16.35** «L-Клуб». **17.20** «Тележурнал «Охрана труда». **17.30** Олимпиада-**96**. Ходьба (женщины). **18.15** «Момент истины». **19.35** Олимпийский курьер. **21.05** Джентльмен-шоу. **21.35** «Мактуб: закон пустыни». Многосерийный х/ф (Италия), 5-я с. **22.40** Олимпиада-**96**. Волейбол (женщины). Штанга.

**Санкт-ПЕТЕРБУРГ**

**11.55, 12.55, 13.55, 16.55, 18.55, 21.55** Информ ТВ. **12.05, 19.20** «Первая любовь». **13.10** Срок ответа сегодня. **13.40** Советы садоводам. **14.05, 21.00** «Зона». **15.05** «Заложница». Х/ф. **16.30** Мультфильм. **16.40, 20.35** Телеслужба безопасности. **17.05** «Философия по Филу». **17.30** Стиль жизни. **17.35** «Уходим завтра в море». Поют дети. **17.55** «Эй, на линкоре!» Х/ф. **18.40** Большой фестиваль. **19.15, 20.50** Спорт. **20.10** «Все о тебе». Романсы Глинки, Чайковского, Рахманинова. **22.15** «Тростинка на ветру». Х/ф, 1-я с.

* румынскую спальню б/у, танна. Тэл.у Менску: **2-35-62-45**.

* сетку ацынкаваную шырынёй **2** м, вентылятар прамысловы з эл. рухавіком, прычэп да а/м, дачу ў в. Жылічы. Тэл.: **72-45-86**.



* запчасткі да "Форд-Сіера" **1987** г.в. універсал. Тэл. у Менску: **57-38-78** - вечарам, **52-50-40** - днём.

* ВАЗ-**2121** "Нива" **1980**г. з запчасткамі (пярэдні і задні мост, раздатка) і др. Капрамонт поўны **1995**г. Форма аплаты любая. Тэл. у г.Ваўкавыску **2-72-39**, пасьля **19** гадзін.

* ВАЗ-**2103** у добрым стане. Тэл. **6-64-79**.

* матацыкл Урал М-**63 1972** г. з запчаскамі. Форма аплаты любая. Тэл. у г.Ваўкавыску **2-72-39**, пасьля **19** гадзін.

* мяккая мэбля РП **280$** Тэл. **6-11-35**.

### КУПЛЮ

* гідраўліку для выцяжкі пры рамонце аўтамбіляў. Тэл.: **45-45-57** з **8.00** да **17.00**, **31-92-91** пасьля **18.00**.

**1**-у ці **2**-х пакаёвую кватэру. Тэл.: **33-46-10**.

* імпартную пальтовую тканіну (можна скуру на куртку). Тэл.: **2-19-89**.

### МЯНЯЮ

* **4**-х пакаёвую прыватызаваную кватэру **55/80** кв. м. **4**-ты паверх, **2** лоджыі па **6** кв. м, кухня **9** кв. м на **2** кватэры. Тэл.: **33-43-86**.

* **3**-х пакаёвы дом **75** кв. м у г. Кіраўску Магілёўскай вобласьці (вада, ванная, прыбіральня, тэлефон, склеп, зямельны надзел, гаспадарчыя пабудовы) на кватэру (дом) у Горадні, альбо прадаю. Тэл.: **(022-37) 22-3-87**.

* добраупарадкаваны цагляны гараж, з ямай на камбінаце будматэрыялаў на гараж з падвалам+даплата. Тэл.: **33-14-27**.

* **2**-х пакаёвую кватэру старой пляніроўкі ў Слоніме+даплата на кватэру ў Гродна. Тэл.: **72-50-50**, вечарам.



### ПАСЛУГІ

* Лячэньне алкагольнай залежнасьці. Доктар К.Ю.Каралёў. Тэл.: **31-05-20**.

* Шыю (і прадаю гатовыя) жаночыя шляпкі з аксаміту, велюру, скуразаменьніка ці з матэрыяла заказчыка. Выдаляю валасы метадам біаэпіляцыі. Тэл.: **31-24-27**.

* Шыю жаночыя спадніцы, штаны. Тэл.: **33-=85-16**, пасьля **17.00**.

* Амерыканскі і ангельскі. Тэл.: **44-86-00**.

* Лячэньне болі ў суставах, мышцах, пазваночніку кваліфікаваным лекарам. Тэл.: **6-53-59**.

* Рамонт і наладка швейных машын і аверлокаў усіх відаў кваліфікаваным майстарам. Тэл.: **6-33-49**.

* Вырабляем дзьверы, вокна і іншыя сталярныя вырабы (танна). Тэл.: **33-22-06**.

* Ветэрынарны лекар (ліцэнзія Міністэрства с/гаспадаркі); прышчэпы, кансультацыі, лекі свойскімі сельскагаспадарчым жывёлам. Тэл.: **6-35-68, 33-93-24**.

* Жанчына з дынастыі ведьзмароў: варажу, здымаю нагавор, сурокі. Тэл.: **33-10-25** з **10.00** да **19.00**.

Будуем гаражы. Тэл.: **6-33-49**.

* Вяжу на спіцах з нітак заказчыка. Тэл.: **6-57-19**.

*Цясьлярныя работы, рамонт мэблі, выраб карпусной мэблі. Тэл.: **44-12-59**.

### РОЗНАЕ

* Шукаю працу прадаўца ці повара. Ёсьць санітарная кніжка. Тэл.: **2-32-62**.

* Маю патрэбу ў сямейным інтэрнаце. Прапановы па адрасу: Гродна-**25**, паштамт, а/я **114**.

* Дастаўка пад заказ: запчасткі новыя і б/у з капрэмонта да трактара МТЗ і ЮМЗ. Зьвяртацца па адрасу: пр. Будаўнікоў, **12**, ком. **88**-А, пасьля **17.00**.

### *ЗНАЁМСТВЫ*

* Пасябрую з жанчынай. Мне - **46/178/80**. Фізічна здаровы, знаходжуся ў месцы пазбаўленьня волі, засталося яшчэ два гады. **222125**, ст. Навасады Барысаўскага р-на Мінскай вобл., установа УЖ-**15/14**, атр. **5**. Бабук Уладзімір Міхайлавіч.

* Мужчына **27/185/75**, парадачны, пазнаёміцца з жанчынай **45-55** гадоў. **230009**, Гродна, а/я **221**, для "В".



## КУПОН · ПРЫВАТНАЯ АБ'ЯВА

16 Імя і прозьвішча ....................

Адрас (тэлефон) ....................

Рубрыка ....................

Тэкст ....................

БЯСПЛАТНА

**Умовы разьмяшчэньня**

Для бясплатнай публікацыі на купоне прымаюцца выключна аб'явы прыватнага характару.

На адным купоне можна даць аб'яву толькі ў адну рубрыку, разборліва напісаўшы тэкст і адрас.

Выразаны купон з тэкстам аб'явы адпраўце поштай, альбо прынясіце ў рэдакцыю самі.

ПАГОНЯ

230023, Горадня, вул. Дамініканская, 1

*Купон сапраўдны на працягу тыдня з моманту выхаду "ПАГОНІ"*



## ПРАЦОЎНЫЯ ВАКАНСІІ

**Усе зьвесткі дадзены па стану на 25 ліпеня.**

**Фірма "Абутак"**, тэл.: 44-83-95, 44-82-99 Закройшчык (пашыў скураных вырабаў) Швачка

**Фірма "Аіта"**, тэл.: 44-65-81 Працавец, гандлёвая адукацыя, досьвед, узрост ад 25 гадоў

**Асацыяцыя "Гроднарамбуд"**, тэл.33-42-73, 33-32-17 Цясьляр, 4 разрад Сталяр, 4-5 разрад, зарплата 1 млн. 500 тыс. Тынкоушчык

**Белдзяржстрах,** тэл.: 44-53-41 Страхавы агент

**ПТВ-41**, тэл.: 44-43-81, 44-50-80 Інжынер-сантэхнік (на пасаду майстра вытворчага навучаньня), зарплата 800 тыс. Майстар вытворчага навучаньня (па сьпецыяльнасьці швачка і кравец), зарплата 800 тыс.руб.

**Фірма "Дарожнік"** , тэл.: 6-42-87, 6-77-26. Бухгалтар-рэвізор Інжынер-энергетык - 1 млн. руб.

**ПМК 69**, тэл.: 2-50-11, 39-95-04. Машыніст катка - 800 тыс. руб.

**ДБУ 18**, тэл.: 6-80-44, 6-81-14. Машыніст катальнай машыны (4,5 разрад, мотакаток і пнеўмакаток)

**Рэстаран чыгуначнага вакзала,** тэл.: 44-63-67. Эканаміст па працы (з вопытам) - 1 млн. 200 тыс. руб.

**ЖЭС 21,** тэл.: 44-41-44 Жасьцяншчык-страхар - 800 тыс. руб.

**З-д ЖБК**, тэл.: 47-49-37, 47-49-26. Сталяр (4 разрад, допуск да станкоў, стаж) - 1 млн. руб. Электрагазазваршчык-газарэзчык - 1 млн. руб.

**З-д Механічны**, тэл.: 47-02-00, 44-83-36. Інжынер па нармаваньню працы - 800 тыс. руб. Сталяр (3 разрад)

**МП "Задыяк-В"**, тэл.: 33-65-78. Дахоўшчык Прараб

**МП "Макс"**, тэл.: 72-21-99. Жасьцяншчык - 1 млн. 500 руб. Муляр - 1 млн. 700 руб.

**Фірма МЖК БУД** , тэл.: 45-28-39. Муляр (4 разрад) - 1 млн. 200 тыс. руб. Маляр (4 разрад) - 1 млн. 200 тыс. руб.

**МПМК-145**, тэл.: 96-72-50 Муляр на будаўніцтва лядовага палаца спорту

**МП "Партнёр"**, тэл.: 33-91-48, 33-32-86. Вадаправодчык (слесар-сантэхнік, 4 разроад) Будаўнік (муляр, цясьляр, тынкоўшчык і г.д.)

**ПМК сенажных вежаў**, тэл.: 2-12-41. Бетоншчык (4 разрад) - 1 млн. 500 тыс. руб. Муляр ( 4, 5 разрад) - 1 млн. 500 тыс. руб.

**ПМК Аблспажыўсаюза**, тэл.: 44-94-40, 44-95-56. Маляр (3,4 разрад) Плітачнік (3,4 разрад) Сталяр (4,5 разрад)

**РБУ Гроднааблаўтатранс**, тэл.: 44-27-00, 44-20-02. Электрагазазваршчык (4,5 разрад) - 1 млн. руб.

**РБУ 1**, тэл.: 72-03-44. Жасьцяншчык - 1 млн. 500 тыс. руб. Каваль - 1 млн. 500 тыс. руб.

**Фірма "Садко"** , тэл.: 2-21-13, 2-43-23. Сталяр (4,5 разрад, пажадана кіроўца) Тынкоўшчык-плітачнік (пажадана кіроўца)

**Фірма "Стэрх"**, тэл.: 2-32-19 Механік па рамонту халадзільных установак


**Фірма "Будаўнік і К"**, тэл.: 44-16-64 Муляр (4 разрад) - 1 млн. руб. Цясьляр (4 разрад) - 1 млн. руб.

**Фірма "Уліс"** , тэл.: 47-13-89 Тынкоўшчык-маляр

**Упраўленьне па рэстаўрацыі**, тэл.: 44-90-11, 45-21-99. Маляр

**Фонд моладзі**, вул. Гая, 2а Манікюрша. Цырульнік.

**ЧАСОВАЯ ГРАМАДЗКАЯ АПЛАЧВАЕМАЯ ПРАЦА:** к-с "Прагрэс" (прапалка цукровых буракоў) к-с "Кастрычнік" (збор ягад і праца ў садзе) к-с "Сьвіслач" (прапалка капусты) к-с "Гродзенскі" (прапалка цукр. буракоў і праца ў садзе) СП "Альфа-100" (апрацоўка крэветак) Гроднажылбуд (будаўнічыя працы) Зьвяртацца па адрасу: г. Горадня, вул. Ажэшка 1, каб. 9, тэл.: 44-91-43.



**☎ 45-29-96**

**Прыватныя бясплатныя аб'явы прымаюцца ў нас і па тэлефону кожны дзень, акрамя суботы і нядзелі.**

***Публікацыя – у пятніцу.***

MEMORIA

*Юры ХАДЫКА*

# БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ НА МЯЖЫ ДВУХ СТАГОДДЗЯЎ

**Беларускі нацыянальна-адраджэнцкі рух імкліва сфармаваўся на пачатку бягучага стагоддзя. Два галоўныя дзейнікі спрычыніліся да масавага выбуху беларускага нацыяналізму. Параза Расейскай імперыі ў расейска-японскай вайне і сканчэньне 40-гадовага тэрміну касацыі ў правах удзельнікаў нацыянальна-вызвольнага паўстаньня 1863-64 гг. Расейская імперыя заўсёды праяўляла схільнасьць да лібералізацыі ўнутрыпалітычнага жыцьця і павагі правоў паняволеных народаў толькі ва ўмовах зьнешняй ці ўнутранай пагрозы яе дэзынтэграцыі. Так было ў часы напалеонаўскіх войн, І і ІІ сусьветных войнаў. Так сталася ў часы гарбачоўскай "перабудовы", выкліканай глыбокім эканамічным і сацыяльна-палітычным крызісам таталітарна-камуністычнай сістэмы.**

**Але кожны раз гэтыя перыяды зьмяняліся больш жорсткай рэакцыяй, чым больш глыбокімі былі працэсы лібералізацыі ў часы вымушанай слабасьці імперыяльнай сістэмы і імперскай ідэалогіі, заквашанай на месіянскай ідэі "выбранасьці" праваслаўнага панславізму.**

Гэткім выглядае зьнешні, незалежны ад волі і выбару беларусаў фон, на якім вось ужо амаль 100 год разьвіваецца нацыянальна-адраджэнцкая ідэя ў Беларусі. Што ж тычыцца ўнутраных асаблівасьцяў беларускага нацыяналізму, то мо самай яскравай яго рысай зьяўляецца арганічны дэмакратызм, як па мэтах, якія ён дэклараваў, так і па складу яго галоўных дзеячоў. Сапраўды, сярод іх нельга знайсьці прадстаўнікоў старых арыстакратычных родаў. Галоўным чынам гэта прадстаўнікі "разначыннай інтэлігенцыі", дробнай шляхты і сялян. Менавіта выразам іх волі стаў Акт абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. І менавіта ім давялося заплаціць сваімі жыцьцямі за кароткі перыяд "беларусізацыі" у 20-х гадах.

У кароткай абрэвіятуры БНР сканцэнтравана ўся беларуская нацыянальная ідэя пачатку стагоддзя. Яна ўпершыню названая беларускаю ў адрозьненьне ад палітычна-гістарычнай назвы Літва. Яна дэкларавана як дэмакратычная антыманархісцкая і антыкаланіяльная праз форму палітычнай арганізацыі новай дзяржавы - рэспубліка, унутраны лад каторай мусіў быць заснаваны на прынцыпе сацыяльнай салідарнасьці -народная.

Таму, калі ў 1988 г. паўстаў БНФ "Адраджэньне", як першы агульнадэмакратычны рух у Беларусі, на сьцягах якога была ідэя нацыянальнага адраджэньня і дзяржаўнай незалежнасьці, ён стаў натуральным правапераемнікам і прадаўжальнікам справы беларускіх нацыянал-дэмакратаў пачатку стагоддзя. І сёньня праз восем гадоў мы з гонарам можам канстатаваць, што БНФ застаецца галоўнаю сілаю нацыянальнага адраджэньня, што гэтыя восем год не прайшлі дарэмна, таму што з розных бакоў можна пачуць меркаваньні пра неабходнасьць аб'яднаўчай нацыянальнай ідэі, якая дазволіла Беларусі скансалідавацца ў перыяд цяжкіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэньняў. Адзначым, напрыклад, выказваньне Старшыні ВС XIII скліканьня сп. С.Шарэцкага, зробленае ім пад час яго славутай прамовы 4 чэрвеня б.г.

Што можна сказаць аб характары гэтай аб'яднаўчай ідэі? Ці можа быць дастатковай ідэя дзяржаўнасьці, ці ідэя правоў чалавека і абароны Канстытуцыі? Так думаюць многія дэмакраты за межамі БНФ. Але перш, чым выказаць сваё меркаваньне, дазвольце мне даволі працяглую цытату з артыкула Д.Фурмана і А.Бухаўца, перадрукаванага "Свабодай" з расейскага часопіса "Свободная мысль": "...в конечном счете Лукашенко - лишь симптом, яркое болезненное проявление глубинных белорусских проблем, мук белорусской самоидентификации... Муки белоруссов проистекают из их неопределенного , неуверенного отношения к самим себе, а это отношение, в свою очередь, - следствие особой, сложной ситуации, в которую поставила их история. Создать из себя нацию по типу прибалтийских наций, поляков или русских, как к этому стремились в начале века и стремятся ныне белорусские националисты, очевидно, уже не удастся... так же трудно им совсем отказаться от себя, стать просто русскими. Для этого время тоже упущено. Быть может в составе Российской империи белорусы просто исчезли бы, став русскими, а католическое меньшинство "ушло бы в поляки", и идея белорусской нации сейчас воспринималась бы как исторический курьез вроде "нации сибиряков."

Пакінем на сумленьні аўтараў песімізм гэтай ацэнкі, фактычна прадказаньне нам лёсу іспанамоўных лацінаамерыканскіх краін. Але адзначым, што галоўная прычына духоўнага заняпаду "белоруссов - трудолюбивых, честных и спокойных людей" яны вызначылі дакладна. Гэта дзьвесьце гадоў каланіяльнага прыгнёту, русіфікацыі, зьнішчэньня гістарычнай памяці і беларускай культуры. Таксама дакладна яны назвалі галоўны лек ад крызісу самаідэнтэфікацыі. Гэта - нацыянальналізм.

Нацыяналізм - тэрмін, які ў цэлым сьвеце эквівалентны тэрміну патрыятызм. Патрыятызм у адносінах да свайго народу, сваёй нацыі. Нацыяналізм стварыў сучасную Эўропу - сям'ю нацыянальных дзяржаў. Пад сьцягам нацыяналізму былі разбураны такія імперыі як іспанская, французкая, ангельская. І разбураецца расейская. Таму нацыяналізм быў лаянкавым словам у межах любой імперскай ідэалогіі. Самы сьвежы прыклад - савецкі імперыялізм, які падтрымліваў нацыянальна-камуністычныя рухі на ўсіх кантынентах, але жорстка падаўляў любыя праявы нацыяналізму на абшарах СССР.

Гэтая спадчына расейска-савецкага шавінізму дасталася і нам. З прыходам да ўлады прэзідэнта А.Лукашэнкі легалізавалася і атрымала дзяржаўную падтрымку дзейнасьць шматлікіх шавіністычных груповак -сапраўднай пятай калоны, якая стала вызначаць як унутраную так і зьнешнюю палітыку дзяржавы. Іх сацыяльная база мізэрная - актывісты камуністычных ветэранскіх арганізацыяў ды інтэлектуальныя



ахвяры камуністычнага рэжыму. Але яны спарадзілі цэлую плеяду адстаўных палкоўнікаў няведамага паходжаньня, што занялі вышэйшыя дзяржаўныя пасады пры прэзідэнце Лукашэнку. Яны разгарнулі непрыхаваны і абразьлівы наступ на сувярэнітэт і парасткі нацыянальнага адраджэньня Беларусі, што знайшло сваё яскравае адлюстраваньне ў беспрэцэдэнтным "Рэферэндуме-95", што знаходзіць свой працяг у антыбеларускай палітыцы ў адукацыі, культуры і сродках масавай інфармацыі.

Фізічнае вызваленьне, як вядома, пачынаецца з вызваленьня духоўнага. Мы ніколі не пазбавімся ад згубных наступстваў каланіяльнага мінулага, ніколі ня здолеем "создать из себя нацию", калі не адмовімся ад навязанай нам імперскай тэрміналогіі, імперскіх міфаў. Калі ня станем называць рэчы сваімі імёнамі - калабарантаў - калабарантамі, здраднікаў і шавіністаў - здраднікамі і шавіністамі. Калі не ўсьвядомім, што разбуральная дзейнасьць антыбеларускіх сіл у Беларусі ня толькі выклікае глыбокі раскол у грамадзтве, але і замарожвае працэс дэмакратызацыі і эканамічных рэформаў, паглыбляе гаспадарчы крызіс і пакуты народу.

І самае страшэннае - адкрытая хлусьня разбурае народную мараль, спараджае песімізм, недавер да ўладаў, эгаізм і пачуцьцё ізаляванасьці і пакінутасьці. У атамізаваным грамадзтве, якое не адчувае нацыянальнай салідарнасьці, пачынаюць квітнець злачынствы, карупцыя, уседазволенасьць і безадказнасьць уладаў.

Вось апошні, але далёка не адзіны прыклад. Многія мабыць памятаюць, як пасьля мітынгу 26 красавіка афіцыйна СМІ па загаду "шэрых" палкоўнікаў абураліся тым, што сорак тысяч нацыянал-фашыстаў па закліку З.Пазьняка ўхвалілі памяць бандыта Д.Дудаева. Іх не спыніла тое, што гэты заклік падтрымала 40 тыс. чалавек. Яны называюць бандытам чалавека, які ўзначаліў нацыянальна-вызваленчую вайну маленькага народу супраць імперыі, як дзесяць год называлі бандытамі афганскіх маджахедаў, якім у рэшце рэшт і прайграла вайну рэгулярная армія. Яны называюць бандытам Дж.Дудаева ня гледзячы на тое, што гэта не Дудаеў з чачэнцамі прыйшоў у Калугу ці Тулу са зброяй і цяжкай вайсковай тэхнікай. А, наадварот, разанскія ці ўральскія "парні" руйнуюць гарады і вёскі Чачні, забіваюць мірных жыхароў, адзіная віна якіх у тым, што яны хочуць незалежнасьці для сваёй радзімы. Паўтараць гэтую відавочную хлусьню могуць толькі людзі пазбаўленыя элементарнай маралі, пазбаўленыя пачуцьця спачуваньня слабейшым і невінаватым - таго пачуцьця, якое адрозьнівае чалавека ад жывёлы. Ці адрозьнівае "камуністычную" мараль з яе прынцыпам - ненавідзь ворага ад гуманізму - асновы традыцыйнай беларускай культуры. Ды і які вораг для Беларусі Чачня? Што губляе Беларусь на Паўночным Каўказе, калі Чачня стане незалежнай? Чаму яна павінна падтрымліваць кровапраліцьце, распаленае расейскімі імперскімі сіламі?

Калі Вы паспрабуеце адказаць на гэтыя пытаньні, то і стане відавочным, па чыёй ініцыятыве была раскручана прапагандысцкая хлусьлівая кампанія супраць БНФ і "бандыта" Дудаева, які на самой справе сваім мужным самаахвярным змаганьнем ужо стаў ня проста нацыянальным героем Чачні, але эпічным героем. Яго імя будзе ўспамінацца чачэнцамі як імя Шаміля. І я ўпэўнены, што прыйдзе час, калі і беларусы з удзячнасьцю будуць ставіцца да памяці Дж. Дудаева, бо ён загінуў і за нашу свабоду.

Дык што ж такое нацыяналізм? Які сэнс мае гэтае слова, якім хочуць абразіць нас нашыя ворагі?

Першае, што трэба адзначыць - нацыяналізм ня ёсьць палітычная праграма. У сьвеце былі і існуюць сёньня як левыя, так і правыя нацыяналістычныя партыі і рухі. Нацыяналізм хутчэй сьветапогляд. Пры гэтым падобна да камунізму і фашызму сьветапогляд калектывісцкі. Дакладней, нацыяналізм - гэта сьвецкі варыянт заходне-хрысьціянскага сьветапогляду. Гэта сьцьвярджэньне я мушу патлумачыць.

Хрысьціянства, як вядома, веравызнаньне, заснаванае, як іншыя монатэістычныя рэлігіі, на прызнаньні роўнасьці людзей. Аднак у сваёй практычнай рэалізацыі яно распадаецца на дзьве галоўныя галіны, якія адрозьніваюцца ў сваёй сацыяльнай практыцы. Калі на ўсходзе царква прызнае за сабою аўтарытэт сьвецкай улады (так званая канцэпцыя цэзарапанізму), то на Захадзе аўтарытэт рымскага патрыярха вышэй сьвецкай улады (канцэпцыя папацэзарызму), у выніку за стагоддзі гістарычнага разьвіцьця ўсходняя галіна хрысьціянства (праваслаўе) стала абслугоўваць імперскія інтарэсы сьвецкай улады, што асабліва выразна бачна на прыкладзе Расейскай імперыі, якая насіла характар сакральнай імперыі і захоўвае ідэалогію выбранасьці, месіянізму да сёньняшняга дня, ня гледзячы на здавалася б неверагодныя трансфармацыі гэтай ідэалогіі ад хрысьціянства да камунізму і назад.

**(Працяг будзе)**



## ГАРАДЗЕНСКІЯ БАЗАРЫ

**Кошты аўтамабіляў на аўтарынку Горадні па стану на нядзелю 21 ліпеня.**

ВАЗ 2101, 1973 г. - $ 1,2
ВАЗ 21011, 1979 г. -$ 1,0
ВАЗ 21011, 1980 г. -$ 1,7
ВАЗ 21013, 1984 г. -$ 2,1
ВАЗ 21013, 1981 г. -$ 2,15
ВАЗ 21013, 1985 г. -$ 2,0
ВАЗ 2102, 1975 г. - $ 1,75
ВАЗ 21053, 1989 г. -$ 4,2
ВАЗ 21063, 1984 г. -$ 2,0
ВАЗ 2107, 1986 г. - $ 2,6
ВАЗ 2109, 1988 г. - $ 4,6
Масквіч 2140, 1984 г. - $ 1,0
Масквіч 2141, 1991 г. - $ 2,7
ГАЗ 24, 1981 г. - $ 2,3
ГАЗ 24, 1987 г. - $ 4,2
Вольва (дызель), 1986 г. - $ 2,3
Вольва 340, 1986 г. - $ 2,2
Фольксваген-Пола - $ 1,2
Фольксваген-Гольф, 1979 г.-$1,75
Фольксваген-Гольф (дызель), 1982 г. - $ 2,4
Фольксаваген-Гольф (дызель), 1990 г. - $ 5,6
Фольксваген-Джэта, 1989 г. - $4,9
Фольксваген-Пасат, 1989 г. -$ 7,3
Фольксваген-Транспарцёр, 1991г- $12,0
Аўдзі 80, 1980 г. - $ 2,0
Аўдзі 80, 1987 г. - $ 5,4
Аўдзі 90 (спорт.), 1985 г. - $ 3,6
Аўдзі 100, 1983 г. - $ 3,3
Аўдзі 100, 1986 г. - $ 3,5
Аўдзі 100 (дызель), 1990 г. - $ 7,7
Аўдзі 100, 1991 г. - $ 11,7
БМВ 324 (дызель), 1986 г. - $ 4,0
БМВ 318, 1981 г. - $ 2,3
БМВ 520, 1989 г. - $ 8,9
БМВ 520, 1989 г. - $ 12,2
БМВ 730, 1988 г. - $ 9,5
БМВ 735, 1987 г. - $ 8,7
Опель-Кадэт (дызель), 1986 г.-$4,0
Опель-Кадэт, 1987 г. - $ 2,9
Опель-Кадэт, 1988 г. - $ 4,2
Опель-Рэкорд, 1980 г. - $ 2,1
Опель-Рэкорд, 1981 г. - $ 2,5
Опель-Рэкорд (дызель), 1987 г.-$ 4,5
Опель-Аскона, 1984 г. - $ 2,1
Опель-Амега, 1987 г. - $ 4,3
Опель-Амега-Караван, 1987 г. - $4,9
Мэрсэдэс 190, 1985 г. - $ 4,8
Мэрсэдэс, 1985 г. - $ 4,7
Мэрсэдэс, 1986 г. - $ 8,6
Мэрсэдэс 230 - $ 7,2
Альфа-Рамэа, 1985 г. - $ 3,3
Лянчыя, 1986 г. - $ 2,3
Фіат (мікраўтобус), 1993 г. - $ 9,9
Рэно 11, 1986 г. - $ 2,6
Рэно, 1986 г. - $ 7,3
Рэно, 1989 г. - $ 4,6
Піжо 605, 1991 г. - $ 10,4
Ровар 820, 1989 г. - $ 5,0
Форд-Сьера, 1984 г. - $ 1,9
Форд-Сьера, 1989 г. - $ 4,5
Форд-Транзіт, 1987 г. - $ 6,45
Форд-Транзіт, 1987 г. - $ 6,5
Мазда 323, 1987 г. - $ 2,4
Мазда 626, 1986 г. - $ 4,0
Мазда 626, 1989 г. - $ 5,4
Хонда-Кубік, 1991 г. - $ 6,7

# ГОНАР БЕЛАРУСІ ВЫРАТОЎВАЕ ГОРАДНЯ

**Найбольш пасьпяхова ў складзе зборнай Беларусі выступаюць на Алімпіядзе спарцмэны Гарадзеншчыны.**

Першы медаль Алімпіяды ў Атланьце ў скарбонку зборнай Беларусі паклаў 21 ліпеня гарадзенскі барэц-"класік" Аляксандр Паўлаў.



Ён заваяваў срэбра ў вагавай катэгорыі да 48 кг., саступіўшы ў фінале чэмпіёну сьвету ў 1995 году Сім Хун Хо з Паўднёвай Карэі.

У першы дзень турніру "грэка-рымлян" медалі заваявалі таксама Сяргей Ліштван з Менску (100 кг, 2-е месца) і гарадзенец Валеры Ціленьць (82 кг, трэцяе месца).

У кроку ад п'едысталу спыніўся трэці гарадзенскі грэка-рымлянін Аляксандр Сідарэнка (90 кг), які ў роўнай барацьбе саступіў у паядынку за 3-е месца немцу Майку Бульману.

Фатальна не пашанцавала ў Атланьце гарадзенскім стралкам Ірыне Шылавай і Канстанціну Лукашыку. 20 ліпеня ў кваліфікацыйных спаборніцтвах абодва нашыя снайперы занялі адпаведна 9-е і 10-е месцы і ня трапілі ў фінал.

Яшчэ адзін шанц на медаль алімпійскі чэмпіён Барселоны меў 22 ліпеня ў стральбе з адвольнага пісталета на 50 метраў. Але ў фінальным пратаколе прозьвішча гарадзенскага снайпера заняло 4-ы радок. Аднак медаль у гэтай дысцыпліне беларусы ўсё ж заваявалі. Літаральна апошнімі стрэламі ў фінальнай серыі выбіў сабе "срэбра" выхаванец гарадзенскай школы стральбы Ігар Басінскі, які прадстаўляе на Алімпіядзе Менск.



На турніры гімнастаў "бронзу" у шматбор'і заваяваў Віталь Шчэрба. Мужчынская зборная Беларусі, у складзе якой выступаў гарадзенец Іван Паўлоўскі, заняла 4-е месца.

У панядзелак Іван паспрачаецца за алімпійскі медаль у апорным скачку.

**Вітаўт РУДНІК.**

**На здымках: Аляксандр Паўлаў і Валеры Ціленьць (зьлева); Ігар Басінскі**

# КУР'ЁЗЫ НА СТАДЫЁНЕ

**... Ужо да дзесятай хвіліны гульні "Нёмана" з "Дняпром" мяч двойчы залятаў у гарадзенскую браму. Праўда, у абодвух выпадках галы не былі залічаныя з-за парушэньняў правілаў. Затое трэці гол магілёўцы забілі правільна. Але... у сваю браму.**

Так выглядала "завязка" непрадказальнага футбольнага сьпектакля, прадэманстраванага гарадзенскім заўзятарам гульцамі "Нёмана" і "Дняпра", якія праводзілі 21 ліпеня прапушчаную яшчэ ў першым туры гульню чэмпіянату краіны. Поўная перавага гасьцей вылілася ў кур'ёзны гол у іх жа браму. Гэта брамнік "Дняпра" Шарэнда, як зачараваны назіраў, як мяч адпасаваны сваім жа гульцом мяч каціцца ў сетку за яго сьпіной... На пачатку другога тайма гаротніка-Шарэнду зьмяніў Харлан, але здарылася гэта ўжо пасьля таго, як Юйко прама з кутняга(!) закруціў мяч у "дзевятку" чужой брамы. Праз некалькі хвілін выхаванец слонімскага футболу Дзьмітрый Агароднік, які другі сезон гуляе за "Днепр", адзін гол адквітаў, але большага магілёўцам дасягнуць не ўдалося. 2:1 на карысьць "Нёмана".

У выніку перамогі гарадзенцы ўпершыню ў гэтым годзе ўзьняліся на дзесятае месца ў турнірнай табліцы.



Фота Я.ВАНЮКЕВІЧА.

**ФУТБОЛЬНЫ ЭКСПРЭС**

**Кубак УЕФА. Папярэдняя стадыя. Адказныя гульні. 24 ліпеня.**

"Дынама" Менск - "Багеміанс" Ірландыя - 0:0 ( у першай сустрэчы 1:1)

"Ціліґул" Малдова - "Дынама-93" Менск - 1:1 (1:3)

Абедзьве беларускія каманды выйшлі ў наступны тур. Іх сапернікі стануць вядомыя сёньня ўвечары.

**Кубак Беларусі. 1/16 фіналу. 23-24 ліпеня.**

"Кардан Флаерс" Горадня - "Шахцёр" Салігорск - 1:1, 3:2 па пенальці.

"Камунальнік" Слонім - "Днепр" Магілёў - 1:3

"Верас" Нясьвіжскі раён - "Нёман" Горадня - 0:1

"Кобрын" - "Абутнік" Ліда - 4:2

**Гульні 1/8 пройдуць 3-4 жніўня.**

# НЯ СЬПІЦЬ ЧЫРВОНЫ ПЕВЕНЬ

**За першыя 6 месяцаў гэтага году ў вобласьці здарылася 865 пажараў, страты ад якіх склалі 18,6 мільярда рублёў. У полымі і дыме загінула 35 чалавек. Кожны другі з іх быў у пеньсійным узросьце.**

Як паведамілі журналістам арганізатар брыфінгу, прысьвечанага дню пажарнай службы, які адбыўся 19 ліпеня, акрамя барацьбы з агнём пажарнікам прыходзілася займацца аварыйна-выратавальнымі работамі. Толькі ў гэтым годзе былі ліквідаваны на пачатковай стадыі тры аварыі на "Азоце", дзьве - на лідзкім заводзе "Оптык", уцечкі аміяка на старым мясакамбінаце і 20 тонаў авіяцыйнай керасіны на таварнай станцыі ў Ваўкавыску.

**В.М.**

## КРЫМІНАЛ

### СТАМБУЛ-КЛАЙПЕДА: ПРАКОЛ

Разнастайнага тавару больш чым на тры тысячы даляраў пазбавіўся каля Багушоўкі прадпрымальнік з Клайпеды. Праехаўшы паў-Эўропы, летувіс, пэўна, стаміўся і прысьнуў за рулём, а прачнуўся ўжо ў ковеце. Выращыўшы, што "раніца вечара мудрэй", ён накіраваўся пераначаваць у хату пры шашы. А зраніцы ўбачыў, што яго "Мерсэдэс" ускрыты, а палова набытага тавару "зрабіла ногі".

### УКРАЛІ 500 рублёў...

На вуліцы Чырвонаармейскай у Горадні двое вясковых хлопцаў ноччу пакваліліся на сумачку ў руках жанчыны. Крык абрабаванай ахвяры пачулі двое курсантаў міліцэйскага вучэбнага корпусу, размешчанага на гэтай жа вуліцы. Яны і затрымалі начных злодзеяў, якім "сьвеціць" зараз да сямі гадоў пазбаўленьня волі. А ў сумачцы, між тым, было ўсяго 500 рублёў і касьметычка...

### МНЕ - ГРОШЫ, А ВАМ - "ЛЯЛЬКУ"

На 45 мільёнаў "кінуў" у Ваўкавыску двух мясцовых жыхароў залётны махляр. Купіліся ж валютчыкі, напэўна, на форму вайсковага маёра і магчымасьць купіць буйную партыю "зялёных" па банкаўскаму курсу. Ды толькі маёр аказаўся несапраўдным, а тры тысячы даляраў - "лялькаю" на 133 "зялёных".

**Іван ДАНІЛОВІЧ.**

# КІНААФІША ГОРАДНІ

**ГРОДНА** 26 ліпеня - "Карнік" - 9.50, 11.40, 13.30, 15.20, 17.10, 19.10, 21.00. 27 ліпеня - Да дня незалежнасьці Рэспублікі Беларусь. Прэм'ера фільма "Сын айца" (уваход свабодны, спонсар О.О.О."Сенэка") - 13.30. "Карнік" - 9.50, 11.40, 15.20, 17.10, 19.10, 21.00. 28 ліпеня - "Карнік" - 9.50, 11.40, 13.30, 15.20, 17.10, 19.10, 21.00. 20-31 ліпеня - "Капальні цара Саламона" (прыгоды) - 9.50, 11.40, 13.30, 15.20, 17.10, 19.10,21.00. ВІДЭА: сеансы - 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00. 26 ліпеня - Цень (фантастычны баявік) 27 і 28 ліпеня - "Маёр Пэйн" (камедыя) 29 і 30 ліпеня - "Забойчы гнеў" (баявік)


**"КАСТРЫЧНІК"** 26-28 ліпеня - "Кароткае замыканьне" - 10.00 (ільготны), 11.40. "Унутраная сіла" (баявік) - 12.30, 15.00. "Крэола - востраў каханьня" - 15.20, 17.10, 18.50, 20.50. "Эратычныя прыгоды трох мушкецёраў" -17.20, 19.10, 21.00. **ВІДЭА:** "Чалавек цемры" (баявік) - 15.00, 18.40. "Увалень Гомі" (камедыя) - 16.50, 20.30. КІНО-ДЗЕЦЯМ: 28 ліпеня - "Па сьлядах Бартэка" - 12.00. "Замучаныя паходам" (прыгоды) - 13.30. "Школьная дыскатэка" - 19.00. 27 ліпеня - Сьвяточная праграма, прысьвечаная Дню незалежнасьці Беларусі - 17.00.

**ім. ПУШКІНА** 26,27 ліпеня - "Гэтыя нешчасьлівыя інапланецяне" - 10.00 (ільготны). "Сьпіна да сьпіны" (прэм'ера, баявік) - 11,40, 15.40, 17.30. "Прафесія-сьцірацель" - 13.30, 19.10. Дыскатэка - 22.00. 28 ліпеня - "Сьпіна да сьпіны" - 12.00, 15.30, 17.30. "Прафесія-сьцірацель" - 13.40. Дыскатэка - 22.00. 29 ліпеня - "Бетховен-2" - 10.00 (ільготны). "Звар'яцелы прафесар" (камедыя) - 13.40, 17.20. "Незьнішчальны шчыён" (камедыя) - 11.50, 15.30.

**"ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"** 26 ліпеня - "Прыбраць перыскоп" (суперкамедыя) - 12.10, 16.30. "Сьпіной да спіны" (супербаявік) - 14.20, 18.40, 20.50. "Тупы і ячшэ тупейшы" - 11.20 (ільготны). "Сэрца дракона" (фантастычны баявік) -13.50. "Эратычныя ночы Элкі" - 16.00, 18.00, 20.00, 27-29 ліпеня - "Прыбраць перыскоп" - 12.10, 16.30. "Сьпіной да сьпіны" - 14.20, 18.40, 20.50. "Лепшыя з лепшых-3" - 11.20 (ільготны). "Сэрца дракона" - 13.50. "Эратычныя ночы Элкі" - 16.00, 18.00, 20.00. Аўтаадказчык кінатэатра "Чырвоная зорка" 72-29-08.

# "БАСОВІШЧА", НІБЫТА "ВУДСТОК"

**19 -21 ліпеня на Беласточчыне адбыўся традыцыйны, сёмы па ліку, фестываль беларускай песьні "Басовішча", ініцыятарам якога выступае Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў (БАС). Лаўрэатамі сёлетняга фэсту сталі і нашыя землякі — удзельнікі гарадзенскай групы "АЙША" ("Джангл Крыстмас"). Яны адзіныя з Беларусі атрымалі ўзнагароду (прэмія БАС). Астатнія прэміі (гран-пры - гурт "Вядро", узнагарода "Радыё Беласток" - гурт "Брага") падзялілі каманды з Польшчы.**



З гэтай нагоды наш карэспандэнт сустрэўся з вакалісткай групы "АЙША" Вікай Назаранка.

***- Пасьля трыумфу Віктара Шалкевіча на "Басовішчы-93", здаецца, ніхто з гарадзенцаў не спадзяваўся і не спрабаваў ня тое, што ўзяць прызавое месца, але й паўдзельнічаць у "Басовішчы". З якім настроем ехала на фэст "АЙША"?***

- Мы нават не разьлічвалі на нейкі там посьпех. Таму ў першы дзень фестывалю крыху разгубіліся, бо не было стопрацэнтнай упэўненасьці ў сваіх сілах. Асабіста я вельмі хвалявалася, што нас не закваліфікуюць і не запросяць выступаць на наступны дзень. Але быў жывы кантакт з публікай, якая музыкаў моцна падтрымлівала. Гэта абнадзейвала. І як жа мы ўзрадаваліся на наступны дзень! Я раздала столькі аўтографаў, колькі ў жыцьці не раздавала! Уразіла таксама нечуваная цікавасьць да музыкаў і выканаўцаў з боку польскай тэлевізіі і радыё. Ім асабліва спадабалася наша песьня "Цжарны супэрмэн".

***- Як ты ацэньваеш арганізацыю фестывалю?***

- Арганізацыя проста фантастычная. Я ніколі такога ня бачыла. Прынамсі, у нас на Беларусі, дзе даводзілася дагэтуль выступаць. А сёлетняе "Басовішча", па словах ветэранаў гэтага фэсту, мела грандыёзны размах. Вялікая колькасьць спонсараў, выдатная рэклама, добра абсталяваная і ўпрыгожаная сцэна. Вельмі хутка вырас палатачны гарадок, сабралася недзе тры тысячы "фанаў", падагрэтых півам "Dojlidy". Адразу адзначу, што не было ніякіх боек, хуліганства. Наадварот, панавала сьвяточная атмасьфера, радасьць і весялосьць. На трэці дзень выступалі таксама фалькларныя гурты, і мне падалося, быццам там беларуская культура мае мацнейшыя пазіцыі, чым у самой Беларусі. Нехта параўнаў "Басовішча" з "Вудстокам"...Шкада, што ў Горадні такога няма.

***- Спадзяюся, пасьля посьпеху на "Басовішчы" "АЙША" не спачне на лаўрах...***

- Ні ў якім разе. У бліжэйшы час мы будзем працаваць над стварэньнем новых песень для паўнавартаснай канцэртнай праграмы і над запісам для беластоцкага і менскага радыё. Хацелася б зрабіць высокаякасны лічбавы запіс, каб потым выдаць альбом. Галоўнае, што такая музыка падабаецца сучаснай моладзі, і таму варта канцэртаваць, развівацца і самаўдасканальвацца.

***- Таму, як кажуць, ні пуха ні пяра, а поўны наперад!***


**Гутарыў Ігар ГАНДЛЕЎСКІ.**

**На здымку: вакалістка групы "АЙША" Віка Назаранка.**

**Фота Я.ВАНЮКЕВІЧА.**

# КРЫЖАВАНКА

*Перакладзі на беларускую мову*



**Па гарызанталі:** 7. Старьё. 8. Родинка. 9. Хлопанье. 10. Культяпка. 11. Вертел. 14. Недоверчивый человек. 17. Тетерев. 18. Матушка, мамочка. 19. Ухажёр. 21. Ссора, грызня. 25. Иностранец. 28. Удар грома. 29. Ковёр. 30. Чёлн. 31. Молодой сосновый лес. 32. Употребление.

**Па вертыкалі:** 1. Мужание. 2. Брусья. 3. Крепость, прочность. 4. Простак. 5. Бросок. 6. Сквозняк. 12. Мечтание. 13. Питомец. 15. Горемыка. 16. Уклан. 20. Обязанность. 22. Наименование. 23. Пища. 24. Недоросль. 26. Юмор. 27. Почёт.

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, АПУБЛІКАВАНУЮ Ў ПАПЯРЭДНІМ НУМАРЫ**

**Па гарызанталі:** 7. Прыцемак. 8. Рыштунак. 11. Спёка. 12. Абраз. 13. Слушнасць. 16. Падлік. 17. Склон. 18. Даніна. 21. Асавік. 22. Намець. 23. Брахун. 24. Вернік. 29. Кольца. 30. Корак. 31. Скабка. 35. Завадатар. 37. Сябар. 38. Капыл. 39. Дзянніца. 40. Сэрцайка.

**Па вертыкалі:** 1. Прыпынак. 2. Уцёкі. 3. Матуля. 4. Мыліца. 5. Журба. 6. Гадавіна. 9. Рэшткі. 10. Кракос. 14. Цікавасць. 15. Чалеснікі. 19. Відук. 20. Памер. 25. Роўнядзь. 26. Лотаць. 27. Пашана. 28. Скарынка. 32. Ласіца. 33. Гарсэт. 34. Багна. 36. Камаш.

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ПАГОНЯ

Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына»

Рэгістрацыйны нумар 465

Падпісны індэкс 63124

Адрас рэдакцыі:

230023, г.Горадня, вул. Дамініканская, 1

(0152) 45-35-61, 45-29-96

E-mail: andrei@pagonia.belpak.grodno.by

FREESPACE BBS 0152-45-37-14 (23.00-10.00)

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасьць за падбор і дакладнасьць фактаў, іх меркаваньні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі.

Адказнасьць за зьмест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Гарадзенская абласная узбуйнёная друкарня: 230023, г.Горадня, вул. Паліграфістаў, 4

Заказ 2541. Наклад 12929

Нумар падпісаны да друку ў 16.00, 25.07.96

Рэдактар Мікола Маркевіч